АКЦЫІ




# ТОБОЙ ГОРЖУСЬ Я, БЕЛАРУСЬ!

Сёлета спаўняецца 35 гадоў незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі далучаецца да тэматычнай інфармацыйнай акцыі «Тобой горжусь я, Беларусь!». У межах акцыі нашы сябры і калегі, сучасныя пісьменнікі Прынёманскага краю разважаюць пра тое, што для іх незалежнасць нашай сінявокай Радзімы.



Двойчы пераможца Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч), член Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік, публіцыст **Ніна РЫБІК** (Астравец):

***Незалежнасць краіны, як і самадастатковасць асобы – перш за ўсё ў разуменні таго, хто ты такі і адкуль «ёсць пайшоў». Яна – у веданні сваіх каранёў, разуменні і прыманні сваёй гісторыі незалежна ад таго, падабаецца табе, што адбывалася шмат гадоў таму ці не вельмі: у любым выпадку пра гэта трэба памятаць. У шанаванні людзей, якія дбалі пра незалежнасць яшчэ тады, калі нават думкі***

***аб гэтым былі крамолай і тых, хто сёння працуе дзеля яе ўмацавання. У павазе да іншых, краін і беражлівых адносінах да свайго, роднага: мовы, культуры, традыцый: «любіш сваё – паважай і чужое, цэніш чужое – шануй і сваё».***

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

Ліпень, 2026